Рэспубліканскае грамадскае аб’яднанне
“Беларускі ПЭН-цэнтр”

# Хартыя Міжнароднага ПЭН-клуба

Хартыя ПЭН-клуба заснаваная на рашэннях, што былі прынятыя на Міжнародных кангрэсах і зводзяцца да наступнага:

1. Літаратура не ведае межаў і мусіць быць даступная людзям незалежна ад любых праблемаў палітычнага ці міжнароднага характару.

2. Пры любых умовах, асабліва ў ваенны час, творы мастацтва і сусветная спадчына ў цэлым не павінныя цярпець у супрацьстаяннях нацыянальнага ці палітычнага характару.

3. Сябры ПЭН-клуба мусяць заўсёды выкарыстоўваць свой уплыў дзеля ўмацавання ўзаемнага разумення і павагі паміж нацыямі, усімі сіламі змагацца супраць расавай, нацыянальнай і класавай варожасці і адстойваць агульначалавечыя ідэалы міру на зямлі.

4. ПЭН-клуб выступае за свабоду думкі ў кожнай краіне і ў міжнародных зносінах, і яго сябры абавязаныя змагацца з любой формай уціску свабоды слова ў сваёй краіне і грамадстве, а таксама, калі гэта магчыма, ва ўсім свеце. ПЭН-клуб выступае за свабоду друку і змагаецца супраць цэнзуры ў мірны час. ПЭН-клуб лічыць, што рух чалавецтва да найвышэйшай формы палітычнай і эканамічнай арганізацыі вымагае свабоднай крытыкі ўрадаў, адміністрацыяў і ўладных структураў. Свабода мае пад сабой добраахвотную адказнасць, таму сябры ПЭН-клуба абавязаныя змагацца з такімі негатыўнымі праявамі свабоднага друку, як хлуслівасць, наўмысная фальсіфікацыя, скажэнне інфармацыі дзеля палітычных і прыватных мэтаў.

Сяброўства ў ПЭН-клубе адкрытае для ўсіх прафесійных пісьменнікаў, выдаўцоў і перакладчыкаў, што падтрымліваюць згаданыя вышэй мэты, незалежна ад іх нацыянальнасці, этнічнага паходжання, мовы, колеру скуры ці рэлігійных перакананняў.